be

TAIZÉ 2017

# Чатыры прапановы на 2017 год

## *Разам адкрываючы шляхі надзеі*

На пачатку верасня 2016 г. чарговы этап Пілігрымкі Даверу на Зямлі сабраў разам 7500 маладых афрыканцаў у Катану, Бенін.[1] Тэма гэтае сустрэчы будзе суправаджаць і натхняць нас у 2017 годзе: ***разам*** – не самому, але пры падтрымцы іншых – ***мы можам адкрыць шляхі надзеі*** – у нас самых, вакол нас і для чалавечае сям'і.

Адно з пытанняў, што было зададзена ў Катану: "Для таго, каб песціць надзею, якім чынам трэба пазбыцца пасіўнае пазіцыі задавальнення, калі мы чакаем зменаў, што прыйдуць звонку?"

Гэта акутальна для тых з іншых кантынентаў, хто слухае афрыканскую моладзь, што прагнуць большае справядлівасці ў палітычных і эканамічных адносінах: гэта адна з умоў для ніх, каб рэальна прадугледзець будаванне будучыні ў іх краінах.

Для таго, каб падрыхтаваць будучыню, усё больш моладзі Афрыкі хоча выкарыстаць іх вялікі творчы патэнцыял. Затым яны змогуць абмеркаваць мужнасць маладзёнаў у іншых частках свету, што знаходзяцца ў падобнае сітуацыі.

Працягваючы рэфлексію, што была распачатая ў Катану, у Тэзэ ды паўсюль, ніжэй пададзеныя чатыры прапановы, якія будуць весці нас да адкрыцця шляхоў надзеі.

Будзьма спрабаваць шукаць шляхі адкрыцця, як зрэалізаваць гэтыя прапановы на практыцы разам са ***сціпласцю***, разам з радасцю і міласэрнасцю, якія Брат Ражэ жадаў размесціць у сэрцы жыцця Супольнасці Тэзэ.

fr. Alois

[1] Пасля Ёханэсбургу (1995), Найробі (2008) і Кігалі (2012), гэты чацвёрты этап Пілігрымкі Даверу на Зямлі быў арганізаваны ў Катану, Бенін, ад 31 жніўня да 4 верасня на запрашэнне Каталіцкага касцёла і метадыстычных цэркваў краіны. Акрамя ўдзельнікаў з Беніну – 7500, галоўным чынам прыехалі з Тога (800), Нігерыі (550), Ганы (100), Буркіна-Фасо (160) і Кот-д'Івуару (50). Увогуле былі прадстаўленыя 20 афрыканскіх краінаў, а таксама 60 еўрапейцаў з 15 розных краінаў. Французская, ангельская і мова фон былі выкарыстаныя пад час варштатаў і форумаў, а падчас літургіі гучалі таксама мовы ёруба і міна.

## *Першая прапанова:*

# Моцна трываць у надзеі: гэта творчасць

*Ён насуперак надзеі паверыў з надзеяй, што стане айцом многіх народаў, паводле казанага: «Такім будзе патомства тваё». (Рымлянаў 4, 18)*

*Надзея для душы ёсць — быццам якар бяспечны і моцны. (Габрэяў 6, 19)*

*Сапраўды кажу вам: хто не прыме Валадарства Божага, як дзіця, той не ўвойдзе ў яго. (Лукі 18, 17)*

У сённяшнім нестабільным свеце мы збянтэжаныя гвалтам, пакутамі і несправядлівасцю. Усё тварэнне енчыць, нібы перажывае боль родаў. Святы Дух таксама енчыць, але гэты ж Дух з'яўляецца падтрымкаю нашае надзеі (гл. Рымлянаў 8, 22 і 26). Але што мы можам зрабіць?

Вера – гэта проста давяраць Богу. Гэта не азначае атрымліваць гатовыя адказы, але азначае для нас не быць спаралізаваным страхам ці збянтэжанасцю. Гэта вядзе нас да актыўнага ўдзелу, вызначае нас у дарозе. Такім чынам мы разумеем, што Евангелле адкрывае шырокі гарызонт надзеі за межамі ўсіх нашых спадзеваў.

Гэтая надзея не проста паспешны аптымізм, што закрывае вочы на рэальнасць, гэта якар укінуты ў Бога. Гэта творчасць. Прыкметы гэтага можам знайсці ў самых нечаканых месцах на зямлі.

- Ці зможам мы верыць у прысутнасць Святога Духа ў нашых сэрцах і ў свеце? Ці можам мы лічыць на тую прысутнасць, нават, калі яна нябачная?
- Хай нашая вера застаецца простаю, як давер дзяцей! Тое не азначае размывання зместу веры, але моцнае трыманне за тое, што знаходзіцца ў цэнтры – Божую любоў для чалавецтва і ўсяго тварэння. Біблія апавядае пра тое, ад моманту зараджэння праз усе перашкоды, а нават непаслухмянства чалавека. Бог ніколі не стамляецца любіць, і тое павінна ўтрымліваць у нас надзею!
- Для таго, каб дазволіць сабе і тым, што побач, быць прасякнутым гэтым пастулатам, нам неабходна часцей збірацца разам на малітву. Сціплая прыгажосць малітвы адлюстроўвае нешта таямнічае ад Бога і можа прывесці да асабістае сустрэчы з Богам.

*Другая прапанова:*

## Спрасціць нашае жыццё, каб дзяліцца гэтым

*Езус кажа: Я ціхі і пакорны сэрцам. (Мацвея 11,29)*

*Задарма атрымалі, задарма давайце. (Мацвея 10,8)*

*Езус адказаў яму: «Калі хочаш быць дасканалым, ідзі, прадай маёмасць сваю і раздай убогім, … пасля прыходзь і ідзі за Мною». (Мацвея 19, 21)*

Хцівасць – гонка за грашыма і поспехам – прыводзіць да несправядлівасці і расчараванняў. Дух дзялення, які запрашае развіваць у нас Евангелле, з'яўляецца адным са шляхоў надзеі, якія нам трэба сёння адкрыць.

Выбіраючы сціплае жыццё, атрымоўваем крыніцу свабоды і радасці. Тады жыццё становіцца менш цяжкім.

Сціпласць прадугледжвае празрыстасць сэрца. Не будучы наіўнаю, яна адмаўляецца ад недаверу. Гэта супрацьлегласць двудушнасці. Гэта дазваляе нам без страху ўступаць у дыялог з кожным, каго сустракаем. Жыццё Езуса з'яўляецца таму прыкладам.

- Занепакоеныя матэрыяльнымі рэчамі, будзьма імкнуцца весці сціплейшае жыццё. Гэта будзе натхняць нас на ўчынак дзялення перад абліччам чалавечых пакут, зневажальнае галечы, выпрабаванняў мігрантаў ці канфліктаў па ўсім свеце.
- Давайце знойдзем спосабы падтрымкі адзін аднаго па рэалізацыі смелых знакаў надзеі па-суседску, у месцы нашае працы ці навучання, з дапамогай грамадскіх ці экалагічных арганізацый.
- Якім чынам мы можам жыць у большае гармоніі са стварэннем праз просты і сціплы лад жыцця, спрыяючы, такім чынам, у барацьбе супраць экалагічных катастроф і глабальнага пацяплення? Гэтая барацьба не толькі для кіраўнікоў нацый; кожны можа, напрыклад, спажываць больш мясцовых прадуктаў, болей карыстацца грамадскім транспартам…
- Ці можа тое пытанне застацца ў нашых сэрцах: я гатовы ісці за Хрыстом, тым, хто ціхі і пакорны сэрцам, вырашыўшы вечна належаць Яму ў шчырасці і духу шчодрасці?

*Трэцяя прапанова:*

## Ісці разам, каб дазволіць рэалізавацца дынамізму Евангелля

*Штодня збіраліся аднадушна ў святыні, і ламаючы дома хлеб, яны спажывалі ежу ў радасці і прастаце сэрца. (Дзеі Апосталаў 2, 46)*

*Розныя ёсць дары, але той самы Дух. Розныя ёсць служэнні, але той самы Пан. (1 Карынцянаў 12, 4-5)*

*Гасціннасці да вандроўнікаў не забывайце; бо праз яе некаторыя, ня ведаючы, гасціннасці прынялі анёлаў. (Габрэяў 13, 2)*

Біблія апавядае гісторыю пра двух мужчын, Пятра і Карнэлія, што дыяметральна адрозніваліся па ўсіх поглядах, але сустрэўшы адзін аднаго, адкрылі раней невядомую абодвум праўду. Трэба было перабываць разам, каб зразумець, што Святы Дух руйнуе муры і яднае тых, хто, як думалі, былі чужынцамі. Дынамізм Евангелля раскрываецца толькі тады, калі мы разам. (Прачытай 10 і 11 главы Дзеяў Апосталаў)

Калі хрысціяне падзеленыя паміж канфесіямі альбо нават у межах адной Царквы, пасланне Евангелля зацямняецца. Ці зможам мы ісці поруч без таго, каб дазваляць розніцам дзяліць нас? Калі мы, хрысціяне, знойдзем шлях, каб паказаць, што еднасць магчымая ў разнастайнасці, дапаможам усяму чалавецтву быць больш з'яднанаю сям'ёю.

- Хрыстус яднае ў адной супольнасці мужчын і жанчын, дзяцей і састарэлых, усе гарызонты, мовы і культуры, а нават тыя з іх, што гістарычна былі процілеглымі. Шукайма простых спосабаў паказаць тое там, дзе мы жывем.
- Каб заставацца жывою, кожная супольнасць пакліканая выйсці па-за свае рамкі. Ці мы можам развіваць пачуццё гасціннасці, на вобраз і падабенства Бога, да хрысціянаў, чые погляды так істотна адрозніваюцца ад нашых? Такая адкрытасць сэрцаў вымагае "перакладу", так як розныя верванні і перакананні могуць быць накшталт замежных моваў.
- Нават калі памяць аб узаемнай нецярпімасці сярод хрысціянаў падзеленых цягам гісторыі застаецца жывою і не ўсе пытанні могуць быць вырашаныя, у любым выпадку будзьма адважнымі прыняць

адзін адно, даруючы, без спробаў усталяваць, хто меў рацыю, а хто завініў? Не бывае прабачэння без ахвяравання.

- Гасціннасць ідзе поруч з прызнаннем іншасці іншых. Калі іх перакананні застаюцца для нас незразумелымі, прынамсі, можам быць чулымі на іх шчырасць. У адкрыцці другога прысутнічае нейкі ўрачысты элемент.

*Чацвёртая прапанова:*

## Дазволіць узрастаць сяброўству дзеля прыгатавання супакою

*Езус не саромеецца называць нас братамі і сёстрамі. (Габрэяў 2, 11)*

*Езус сказаў: адзін у вас Настаўнік, а ўсе вы — браты і сёстры. І айцом вашым не называйце нікога на зямлі, бо адзін у вас Айцец Нябесны. (Мацвея 23, 8-9) Ён таксама сказаў: Бо хто выконвае волю Айца Майго, які ў нябёсах, той Мне брат, і сястра, і маці. (Мацвея 12, 50)*

*І прыйдуць з усходу і з захаду, з поўначы і з поўдня, і сядуць за стол у Валадарстве Божым. (Лукі 13, 29)*

Яшчэ адзін шлях надзеі, які мы сёння можам адкрыць, гэта чыны на карысць супакою і міжнароднае справядлівасці.

Супакой на зямлі пачынаецца ў сэрцы кожнае асобы. Перадусім належыць змяніць свае сэрцы, і гэтая змена складаецца з простага пераўтварэння – дазваляючы Духу Божаму знаходзіцца ў нас, вітаючы супакой, што будзе распаўсюджвацца і перадавацца адно аднаму. “Дасягніце ўнутранага супакою, а тысячы вакол вас будуць збаўленыя“. (Серафім Сароўскі, рускі манах, 1759-1833).

- Давайце нашым уласным жыццём пісаць новыя старонкі простае салідарнасці, што выходзіць па-за межы муроў і падзелаў: фізічных муроў, збудаваных у розных частках свету, але таксама муроў невуцтва, забабонаў і ідэалогіі. Будзьма адкрытымі на іншыя культуры і менталітэты.
- Мы не можам не дазволіць увайсці ў нашыя сэрцы чужынцам, бо адмаўленне ад іншых з'яўляецца насеннем варварства. Замест таго, каб бачыць у чужынцах пагрозу нашаму ўзроўню жыцця ці культуры, ці можам мы прыняць іх у якасці чальцоў адной і той жа чалавечае сям'і? Чаму б проста не пайсці наведаць бежанцаў, каб проста пазнаёміцца з імі, паслухаць іх аповедаў? Затым – хто ведае – услед могуць рушыць іншыя крокі.
- Якім чынам мы можам пазнаць іншых, што адрозніваюцца ад нас? Дзяліцца з тымі, хто думае інакш, у дыялогу, калі мы насамрэч слухаем адзін адно, не пераходзячы на аргументы яшчэ да таго, як зразумелі іншую асобу. Ці можам мы знайсці шляхі, што засталіся ў месцах падзелу, і будаваць масты? Памолімся за тых, каго мы не разумеем, і за тых, хто не разумее нас.
- Прыкметы салідарнасці могуць быць памножаныя і па-за межамі рэлігіі. Сустрэча вернікаў іншых рэлігій заахвочвае нас да паглыблення ведаў аб нашае ўласнае веры, пытаючы тым часам сябе: што Бог хоча сказаць нам і даць нам праз гэтых братоў і сясцёр, што так адрозніваюцца ад нас.

*На працягу бліжэйшых месяцаў мы будзьма публікаваць на старонцы Тэзэ ў сеціве, а таксама ў нашых сацыяльных сетках асабістыя дасвядчэнні тых, што паспрабуюць жыць паводле "Прапановаў на 2017 год". Ты таксама можаш падзяліцца з намі сваімі ўражаннямі, напісаўшы на echoes@taize.fr, а таксама заставацца на сувязі з намі праз наступныя старонкі:*

www.taize.fr/news @taize @taize @taize (en) @taize_fr (fr)

# Заклік да царкоўных лідараў на 2017 год

## *Разам на шляху!*

У 2017 г. 500-годдзе Рэфармацыі прапануе магчымасць прасоўвання наперад адзінства і выйсця па-за межы простае ўзаемнае ветлівасці.

Адрозненні паміж Царквамі заўсёды будуць, таксама як і ўнутры адной Царквы. Гэтыя адрозненні будуць прадметам адкрытага дыялогу; яны могуць быць узбагачэннем. Але цягам доўгага часу ва ўсіх Царквах перавагу аддавалі канфесійнае прыналежнасці: людзі вызначалі сябе пратэстантамі, каталікамі ці праваслаўнымі. Ці не надыйшоў час, каб аддаць перавагу хрысціянскае свядомасці, атрыманай у хросце?

Адсюль вынікае пытанне: ці не павінны Цэрквы адважыцца на тое, каб сабрацца пад адным дахам, не чакаючы ўсталення згоды па ўсіх тэалагічных пытаннях? Ці, прынамсі, прыйсці пад адзін намёт, адыходзячы ад статычнага пункту гледжання на адзінства, каб ствараць і шукаць шляхоў, нават часовага характару, што ўжо прадбачаць радасць адзінства і выклікаюць бачныя прыкметы Божае Царквы, каб з'явіліся Цела Хрыста, Еднасць Святога Духа.

Еднасць пасярод усіх тых, што любяць Хрыста, можа быць усталяваная толькі тады, калі яна паважае разнастайнасць; але такая еднасць можа быць верагоднаю толькі тады, калі яна бачная. Нам патрэбны новы зыходны пункт, каб накіравацца да такой бесканфліктнай разнастайнасці. Зыходным пунктам з'яўляецца Хрыстус, які не падзелены. "Толькі праз Езуса Хрыста мы з'яўляемся братамі... Праз Хрыста нашая прыналежнасць рэальная, цалкавітая і на ўсе часы" (Дытрых Банхофер).

Такім чынам, мы можам абмяняцца дарамі: дзяліцца з іншымі тым, што мы лічым дарам Божым, але таксама прымаючы скарбы, якія Бог заклаў там. "Справа не толькі ў атрыманні інфармацыі пра іншых, каб лепш пазнаць іх, але ў тым, каб прыняць Духа, што даў іх нам у якасці дара" (папа Францішак).

Якім чынам мы можам сабрацца пад адным дахам? Як мы можам разам выйсці ў шлях? Ніжэй некалькі прапановаў:

- З блізкімі і сем'ямі сабраць некалькі "падставовых" суполак, каб, молячыся разам, слухаць Божае Слова, у цішыні і праслаўленні, дапамагаючы адзін аднаму, пазнаючы лепш адзін адно.
- Кожная мясцовая суполка, кожная парафія ці збор павінны дзейнічаць з хрысціянамі іншых дэнамінацый ва ўсім, што можна рабіць разам: вывучаць Біблію, весці сацыяльную і душпастарскую працу, катэхізаваць, і

не рабіць нічога, не бяручы пад увагу іншых. Структуры, што паралельна выконваюць тую ж дзейнасць, могуць быць абʼяднаныя.

- Распачаць сумесныя акты салідарнасці, супольна звярнуць увагу на пакуты іншых, на прыхаваны непакой, на бядоту мігрантаў, на матэрыяльную галечу і ўсі іншыя формы пакут, памятаючы таксама пра клопат над навакольным асяроддзем.
- У шматлікіх гарадах, дзе ўжо зʼявіўся давер паміж Цэрквамі, ці не мог бы сабор ці катэдра стаць супольным домам малітвы для ўсіх хрысціян рэгіёну?
- Пасоўвацца наперад у тэалагічным дыялогу разам з развіццём вымярэння супольнае малітвы і свядомасці таго, што мы ўжо разам. Узрастаючы ў сумесным сяброўстве і молячыся разам, тэалагічныя пытанні бачацца ў іншым святле.
- Нават калі ўсі хрысціяне атрымалі некаторую долю ў якасці пастырскага дару спаглядаць адзін на аднаго, Царква таксама патрабуе служыцеляў адзінства на ўсіх узроўнях. Служэнне еднасці на ўніверсальным узроўні традыцыйна атаясамліваецца з біскупам Рыму. Ці б не было магчыма для Цэркваў развіваць разнастайныя спосабы атаясамліваць сябе з гэтае паслугаю? Ці не мог бы біскуп Рыму быць прызнаны ўсімі за слугу, што назірае за сваімі братамі і сёстрамі ў іх вялікай разнастайнасці?
- Ці не павінны Цэрквы, дзе падкрэсліваецца, што еднасць у веры і згода наконт служэння неабходныя да таго, каб атрымаць супольную еднасць і надаць роўную вагу гармоніі ўзаемнае любові? Ці маглі б яны прапанаваць больш шырокую эўхарыстычную гасціну тым, хто дэманструе сваё імкненне да адзінства і якія вераць у рэальную прысутнасць Хрыста? Эўхарыстыя зʼяўляецца не толькі кульмінацыяй адзінства, але гэта й шлях, што вядзе да яго.

Нашая хрысціянская свядомасць кшталтуецца супольным непадзельным падарожжам. Ці будзе ў нас смеласць сабрацца пад адным дахам, такім чынам, каб раскрыліся дынамізм і праўда Евангелля?

# Разам да еднасці Еўрапейскага кантыненту

## *Пераадолеем страх перад прыбываючымі мігрантамі!*

Сустрэча ў Рызе, арганізаваная Супольнасцю Тэзэ напрыканцы снежня 2016 г. збірае разам моладзь з усяе Еўропы.[1] Прыязджаюць, як з краін Еўразвязу, так і з па-за ягоных межаў, яны маюць дасвядчэнне супольнасці, здольнага аб'яднаць людзей з усяго кантыненту.

Гэтая паўночная сустрэча таксама дазволіла моладзі з іншых рэгіёнаў адкрыць Еўропу балтыйскіх краін, адну з граняў прыгожай разнастайнасці народаў на гэтым кантыненце, кожнага з уласнае гісторыяй, традыцыямі і асаблівасцямі.

Будучыня супакою вымагае ад еўрапейцаў пашыраць сваю інфармаванасць і дазваляць пашырацца салідарнасці ва ўсіх краінах на кантыненце. Памнажэнне кантактаў, формаў дзялення і супрацоўніцтва з'яўляецца неад'емнаю рэччу.

Пабудова адзінства на кантыненце магчымая толькі ў тым выпадку, калі будзе больш актыўнага дыялогу і прыслухоўвання краін адзін да аднаго: тых у Еўразвязе, і тых з па-за, тых з Заходняе Еўропы, і тых з Еўропы Цэнтральнае й Усходняе, тых з поўначы і поўдня. Кожная краіна, вялікая ці малая, павінна мець права мець голас са сваёю спецыфікаю. Важна прыкласці намаганні, дзеля таго, каб зразумець ад сярэдзіны менталітэт іншых: толькі такім чынам часам супярэчлівыя адносіны могуць быць лепш зразуметы, а выключна ж эмацыйных рэакцый варта пазбягаць.

Ці могуць еўрапейцы зразумець, што іх супольныя шляхі значна больш сумесныя, чым іх адрозненні?

У выніку Другой сусветнай вайны Еўропа супольна выпрацавала імпульс да прабачэння. Пазней, пасля зруйнавання Берлінскага муру, паўстала новая эра пошукаў адзінства. Багата маладзёнаў адчулі, што Еўропа будзе развівацца толькі тады, калі больш глыбока ўвойдзе ў той ідэал братэрства. Яны імкнуцца да Еўропы з'яднанай не толькі ў самой сабе, але адкрыцца на іншыя краіны і ў салідарнасці з народамі, дзе маюць месца вялікія выпрабаванні.

Па ўсім свеце жанчыны і мужчыны, таксама дзеці вымушаныя да апушчэння сваіх дамоў. Бядота змушае іх учыніць гэта. Тая матывацыя мацнейшая за ўсе бар'еры, што паўстаюць на іх дарозе. Непакой не будзе адчувальны так сама ў багатых рэгіёнах, як у бедных, дзе людзі нязносна пакутуюць, будучы вымушанымі пакінуць сваё жытло.

Некаторыя людзі кажуць: “Мы не можам прыняць усіх”. Іншыя разумеюць, што актуальныя перамяшчэнні людзей непазбежныя, бо выкліканыя невыноснае сітуацыяй. Відавочна, што гэты рух варта кантраляваць, у тым ліку на падставе права. Пакідаючы бежанцаў у руках кантрабандыстаў і перад пагрозамі ў Міжземнамор’і, кідаем выклік чалавечым каштоўнасцям.

Заможныя краіны не могуць ухіліцца ад сваёй часткі адказнасці за гістарычныя раны і ўмяшанне ў асяроддзе, што прывяло і працягвае выклікаць вялікія міграцыі з Афрыкі, Блізкага Ўсходу, Цэнтральнае Амерыкі ды іншых рэгіёнаў. Сёння некаторыя палітычныя і эканамічныя рашэнні, што прымаюцца заможнымі краінамі, надаль ствараюць нестабільнасць у іншых галінах. Грамадствам на Захадзе варта пазбыцца страху перад чужынцамі, розніцамі культур, а пачаць смела кшталтаваць новае аблічча таго, што дае міграцыя. Хаця прыбыццё мігрантаў насамрэч стварае багата цяжкасцяў, іх з’яўленне дае магчымасць Еўропе развіваць адкрытасць і салідарнасць.

У некаторых месцах лічба чужынцаў настолькі значная, што мясцовыя жыхары абцяжараныя і вычарпаныя, і тое зразумела. Цяжар занадта вялікі, бо да сённяшняга дня Еўропа не вырашыла, якім чынам несці яго разам. Але многія людзі прапануюць бежанцам цёплы прыём і адкрываюць, што асабістыя кантакты часцяком могуць прывесці да цудоўнага ўзаемапаразумення.

Нішто не заменіць асабістых кантактаў. Гэта перш за ўсё датычыць ісламу. Мусульмане і хрысціяне могуць сумесна шукаць практычных крокаў, каб разам сведчыць у пытаннях супакою і разам адкідваць гвалт, што чыніцца ў імя Бога. Каля 800 гадоў таму Францішак Асізскі, жадаючы зрабіць свой унёсак на рэч супакою, не завагаўся перад паездкаю ў Егіпет, каб сустрэць султана. Маці Тэрэза прысвяціла сваё жыццё найбяднейшым з бедных, не зважаючы на іх рэлігію.

Еўрапейскія краіны, што прагнуць ізалявацца, не маюць будучыні. Сярод еўрапейцаў, як зрэштаю і ў кантактах з бежанцамі, сяброўства і ўзаемападтрымка з’яўляюцца адзіным шляхам прыгатавання супакою.

[1] З 28 снежня 2016 г. па 1 студзеня 2017 г. маладзёны з усяго кантыненту – каталікі, праваслаўныя і пратэстанты – узялі ўдзел у 39-ае Еўрапейскае Сустрэчы, арганізаванай Супольнасцю Тэзэ ў Рызе, латвійскае сталіцы. 2 студзеня гэтая сустрэча перанеслася ў Талін (Эстонія) і Вільню (Летува). Гэта быў чарговы этап Пілігрымкі Даверу на Зямлі, якая праводзіцца Тэзэ цягам многіх гадоў.

## Тэзэ 2017

*Праз увесь год:*

Штотыдзень, ад нядзелі да нядзелі, адбываюцца сустрэчы для моладзі, каб знайсці вытокі веры, каб шукаць шляхі сумесных пошукаў надзеі ў сабе, навокал і дзеля ўсяго чалавецтва.

*У перыяд з 20 па 27 жніўня:*

Тыдзень, што прыгатаваны для маладзёнаў ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў – студэнтаў, маладых спецыялістаў, валанцёраў, працуючых і тых, хто шукае працы. У святле веры яны разам змогуць паразважаць над сваёй верай. Будуць запрошаныя таксама розныя прамоўцы, каб падзяліцца сваім асабістым дасвядчэннем.

## Бірмінгем (Злучанае Каралеўства)

Брат Алоіс будзе дапамагаць весці сустрэчу моладзі ў Бірмінгеме, Ангелія, ад пятніцы 28 красавіка да панядзелку 1 траўня 2017 г. Выходныя "Схаваны скарб" рыхтуюцца сумесна з мясцовымі гарадскімі цэрквамі. Гэта будзе ўрачыстасць сціплых абавязкаў многіх людзей. Бірмінгем – пераважна горад моладзі і этнічнае разнастайнасці: на сустрэчу запрашаюцца прадстаўнікі ўсіх краін!

## Сэнт-Луіс (ЗША)

Амерыканскі этап Пілігрымкі Даверу на Зямлі адбудзецца ў Сэнт-Луісе, ЗША, дзе захоўваецца напружанасць пасля падзей двухгадовай даўніны ў Фергюсоне. Цягам году шэраг сустрэчаў, што збіралі людзей на малітву з розных цэркваў, завершыцца вялікаю сустрэчаю-размоваю па ўмацаванні даверу, што адбудзецца 26-29 траўня з удзелам моладзі з усяе Паўночнае Амерыкі.

## Егіпет

Разам з братамі і моладдзю з розных краін Брат Алоіс наведае Егіпет, й асабліва Копцкую Царкву, у перыяд ад 26 верасня па 1 кастрычніка.

## Ад Вітэнбергу да Жэневы

У 2017 годзе, 500-гадовую гадавіну Рэфармацыі, Супольнасць Тэзэ запрасілі, каб правесці дзве малітвы:

- субота 27 траўня ў Вітэнбергу, горадзе Лютэра, як частка Тыдня цэркваў (ням. Kirchentag) Нямецкае Пратэстанцкае Царквы,
- пятніца 3 лістапада ў катэдры Жэневы ў часе моладзевае сустрэчы, што арганізаваная Федэрацыяй Пратэстанцкіх Цэркваў Швейцарыі і сеткаю евангельскіх цэркваў.

## Базэль 2017-2018

40-ая Еўрапейская Сустрэча будзе праходзіць у днях 28 снежня 2017 -
1 студзеня 2018 у швейцарскім Базэлі.

*Дзеля больш падрабязнай інфармацыі наконт сустрэчаў, глядзі www.taize.fr*